**Палулех, З.** Ордэн за мужнасць / З. Палулех // Браслаўская звязда. — 1988. — 20 лют. — С. 2.

**ОРДЭН ЗА МУЖНАСЦЬ**

Мне часам здаецца, што мы стаміліся. Стаміліся ад штодзённай мітусні, ад шалёных скорасцей, перасталі здзіўляцца, прыкмячаць навокал цудоўнае. Пакінулі гэта паэтам і закаханым. Калі б усім на час даць крылы, каб паглядзелі на кіпячы ўнізе мурашнік, а спусціўшыся, спыніліся, прызадумаліся, звярнуліся да памяці...

Да памяці людской у яго, Часлава Гендэля, свае, асабістыя адносіны.

Цяпер яго часта называюць воінам-інтэрнацыяналістам. Ён чуў, як свісчуць кулі, калі прыцэльна б'е вораг. Ён ратаваў ад смерці таварышаў. Прайшоў школу Афганістана, школу бескарыслівай дапамогі суседняму народу. Усё ўбачанае і перажытае там, у Афганістане, застанецца ў памяці на ўсё жыццё.

Афганістан раскалоў яго жыццё на дзве палавіны. Вось ён рухавы хлопец – весялун. А вось – чалавек, які імкнецца вярнуцца назад, у мірнае жыццё. Засяроджаны, стрыманы, сур'ёзны. Пераацэньвае сябе, пераацэньвае іншых. Судзіць строга, жорстка ўсіх, у тым ліку і сябе. Хто вораг, хто сябар тут, у Саюзе? Яго мучаюць па начах думкі, яму сніцца Афганістан. Данімаюць раны, фізічныя і душэўныя, нанесеныя людзьмі, незнарок або наўмысна.

...Падраздзяленне атрымала загад: акружыць кішлак, дзе прытаіліся душманы. Праз кішлак канал пракладзены, і гэта – адзіны шлях для адыходу бандытаў. Кулямётчык Часлаў Гендэль абавязаны быў не даць ворагу прайсці, трымаць канал пад прыцэльмым агнём. Доўга вёў бой салдат, і ўсё ж душманская куля не мінула яго... Ачнуўся ў шпіталі. А потым было яшчэ адно раненне.

Аб тым, што засталося болем у сэрцы па ўсё жыццё, што ўжо ніколі не выкрэсліш з памяці, ён расказвае вельмі стрымана і ў той жа час узрушана, утаропіўшы позірк некуды ўдалячынь.

Амаль два пакаленні савецкіх людзей не чулі грукату вайны. Тыя ж, хто служыў там, у Афганістане, выпрабаваны яе агнём.

– Я, калі прыехаў дамоў, усё ніяк не мог прывыкнуць да цішыні, – расказваў Часлаў. – Мне ўсё здавалася, што вось-вось аднекуль прагрыміць аўтаматная ці кулямётная чарга, і ты павінен быць гатовым у любое імгненне даць адпор ворагу...

– Сябар у мяне быў, – пасля некаторага маўчання працягваў Часлаў. – Алегам звалі. Вярталіся з баявых дзеянняў. Вечарам размясціліся на адпачынак і вельмі сціпла, па-салдацку адзначылі яго дваццаціголдзе. А раніцай мы з Алегам пайшлі на пост. І тут… нас з ім адной чаргой... разанулі. Мяне крыху зачапіла, а яго... навылет у галаву... Сына свайго я ў яго гонар Алежкам назваў.

Часлаў робіцца на некаторы час зноў маўклівым, сумным. успамінаючы пра сябра. Дваццаць год яму толькі што споўнілася. Дваццаць – як гэта мала і як многа. Там, у Афганістане, просты арыфметычны падлік «год за тры» здольны павялічвацца, у адзін год укладваецца гадоў дзесяць. А то і больш. Для усіх, хто ведаў Алега, ён застаўся назаўсёды маладым...

Там у гэтых хлопцаў вельмі моцна развіты пачуцці таварыскасці, узаемадапамогі, узаемаразумення. Там было асобае брацтва. І камандзіры былі там такія, з якімі сапраўды хоць у агонь і ваду. А салдаты адзін за аднаго – гарой.

– Пайшоў у горы аднапалчанін Ігар Чмураў, з ім былі яшчэ трое… На баявую пазіцыю. Моцна населі на іх душманы. Ігар застаўся адзін. Разумеў, што сілы на баку бандытаў. Калі скончыліся патроны, падрыхтаваў гранату, у палон вырашыў не здавацца. А тут мы з хлопцамі падаспелі. Сэрца падказала, што сябра трапіў у бяду. Ігар паранены быў. Я хуценька аказаў яму дапамогу. І мы перанеслі яго з гор уніз, даставілі ў медчасць. Цяпер Ігар у Маскве жыве. Герой Савецкага Саюза.

Чеслаў Гендэль – кавалер ордэна Чырвонай Зоркі. Ён не любіць адказваць на пытанне, за што атрымаў высокую ўзнагароду.

– Проста за тое, што «там» быў, – вось яго адказ.

А жыццё «там» было асобае, поўнае небяспек, нечаканасцей. «Там» маладыя байцы стаялі насмерць.

23 мая 1986 года ён вяртаўся дамоў, у бацькоўскую хату, што ў вёсцы Закор'е. Родных загадзя не папярэджваў аб прыездзе. Калі ж па знаёмай з дзяцінства сцяжынцы падыйшоў да роднага парога, нават сумеўся. Не рашаўся адкрыць дзверы. Была раніца. І тут… дзверы самі адчыніліся. на парозе паўстала маці, уся ў мірных дамашніх турботах, са збанам малака ў руках. Убачыўшы сына, Антаніна Антонаўна толькі ўскрыкнула і прыпала да шырокіх, узмужнелых грудзей сына. З бацькам абняліся моцна, па-мужчынску, глянулі адзін аднаму ў вочы. Збігнеў Браніслававіч убачыў у вачах ужо зусім дарослага сына слёзы.

Часлаў увесь час раўняўся ў сваім жыцці на бацьку. Хацеў быць ва ўсім падобным да яго. Таму пасля заканчэння школы пайшоў па слядах бацькі, сеў на трактар. Аднак пасля службы ў Афганістане пайшоў працаваць у Даўгаўпілскі раённы аддзел унутраных спраў. У гэтым горадзе жылі і працавалі яго родныя сястра і брат. Аднак з часам усё роўна пацягнула ў родныя мясціны, бліжэй да бацькоўскага дому. Вось ужо два месяцы, як Часлаў перавёўся ў Браслаўскі РАУС. Зарэкамендаваў сябе добрасумленным, шчырым, прынцыповым супрацоўнікам. Ды і не можа ён інакш. Выпрабаваны агнём баёў, загартаваны ў нялёгкім змаганні з ворагам.

Яны, «афганцы», лепш за іншых адчуваюць кожную, амаль непрыкметную несправядлівасць. Некаторыя ў гэтым жыцці прывыклі даставаць, выбіваць, выкручвацца. А гэта часам бывае і незаконна, з гэтым неабходна змагацца. Таму ён і вырашыў прысвяціць свой лёс барацьбе з усякага роду несправядлівасцю.

Яму ўвесь час здаецца, што чагосьці не зробіць, не паспее, што жыццё пройдзе міма, не закрануўшы яго. Ва ўсім хоча разабрацца. Часам перажывае, сумняваючыся. Ён вытрымаў цяжкія выпрабаванні. А цяпер праходзіць яшчэ праз адно – выпрабаванне мірным жыццём. Часлаў не можа зразумець тых, чыё жыццё цячэ як вада ў рэчцы, – па плыні. Тых, якія, мабыць, ні разу не ішлі супраць, не жылі сапраўдным жыццём, напоўненым асаблівым зместам, якія існуюць за кошт бацькоў, за кошт дзяржавы або яшчэ за чый-небудзь...

У яго ёсць планы, ёсць свае мары. Імі ён дзеліцца з сябрамі дзяцінства Алегам Наргелем і Міхаілам Кратом. На рабоце разам з Леанідам Мікштам, які таксама прайшоў школу Афганістана, гавораць аб перажытым, часта нам і незразумелым, успамінаюць баі, загінуўшых. Вырашылі стварыць клуб воінаў-інтэрнацыяналістаў запасу.

А яшчэ ён заўсёды спяшаецца дамоў. Ведае, што яго там з нецярпеннем чакаюць жонка Раіса і маленькі Алежка. Разам з імі яму лягчэй вяртацца ў мірнае жыццё...

**З. Палулех**